преподавателей необходимо постоянно обновлять и пополнять библиотечные фонды. Студенты считают, что в перспективе библиотеки будут существовать в цифровом формате, где наряду с классическими книгами будут представлены медиа-файлы, аудио-файлы. Данные исследования подтверждают общероссийскую тенденцию использования информационных технологий в современной системе высшего образования.

1. *О библиотечном* деле: Федер. закон от 29.12.1994 № 78-ФЗ ст. 1 (ред. от 03.07.2016) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://fzrf.su/zakon/o-bibliotechnom-dele-78-fz/st-1.php. – Дата доступа: 12.06.2019.

2. *Свергунова, Н. М.* История как будни: Статус: Вузовская. Штрихи к портрету / Н. М. Свергунова // Библиотека. – 2008. – № 2. – С. 35-38.

3. *Анализ* современного состояния и перспектив развития библиотеки НИУ ВШЭ» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vuzlit.ru/73448/analiz_sovremennogo_sostoyaniya_perspektiv_razvitiya_bibliotek. – Дата доступа: 12.06.2019.

***Доўнар Ларыса Іосіфаўна***

## Першыя выкладчыкі курса «История книги» на бібліятэчным факультэце

У артыкуле разгледжана пытанне аб пачатках выкладання курса «Истории книги» ў першым дзесяцігоддзі існавання бібліятэчнага факультэта. Аналізуюцца выяўленыя архіўныя звесткі і публікацыі пра С. М. Срэдзінскага і Г. С. Акулава, дзякуючы якім «История книги» як прадмет атрымала ў МДПІ пачатак і далейшае развіццё.

*Ключавыя словы:* гісторыя кнігі; гісторыя бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі.

***Lora I. Dounar***

## The First Teachers of the Course «History of the Book» at the Library Faculty

The article deals with the question of the principles of teaching the course «History of the Book» in the first decade of the library faculty. The article analyzes the identified archival data and publications about S. M. Sredinsky and G. S. Akulov, thanks to which the «History of the Book» as a subject received the beginning and further development in MSPI.

*Keywords*: history of the book; history of library education in Belarus.

Асноўнай мэтай нашага артыкула з’яўляецца прэзентацыя паводле архіўных дакументаў дзейнасці тых выкладчыкаў бібліятэчнага факультэта, якія распрацоўвалі гісторыка-кнігазнаўчую праблематыку ў перыяд зараджэння вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі.

Першыя крокі па арганізацыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі, ажыццёўленыя ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага (МДПІ) і звязаныя са стварэннем у ВНУ кафедры бібліятэказнаўства (у 1944/1945 навуч. г.), мелі шэраг цяжкасцей, галоўнай з якіх быў недахоп кадраў. Таму для чытання курсаў па спецыяльных прадметах на бібліятэчны факультэт запрашаліся спецыялісты з іншых ВНУ, у іх ліку – з Ленінграда і Масквы.

Найранейшыя звесткі, якія захаваліся ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НА РБ) і сведчаць пра выкладанне курса «История книги» на бібліятэчным факультэце МДПІ, адносяцца да 1947/1948 навучальнага года, калі гэты прадмет пачаў чытаць дацэнт кафедры бібліятэказнаўства *Сяргей Мікалаевіч Срэдзінскі* (Сергей Николаевич Срединский) [9, арк. 386; 14, арк. 391; 15, арк. 87, 261; 16, арк. 68]. Ён меў багаты вопыт у галіне журналістыкі: быў адным з арганізатараў Саюза журналістаў у Петраградзе,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаяў ля вытокаў першай навукова-адукацыйнай школы журналістыкі ў Расіі, працаваў у 1920-х гг. у Дзяржаўным інстытуце журналістыкі ў Маскве (Государственный институт журналистики – ГИЖ) і чытаў курс «Газетная техника», быў аўтарам першых вучэбных і практычных дапаможнікаў па выдавецкай справе і газетазнаўству: «Основы газетного дела» (1918)[6], «Газетно-издательское дело» (1924)[7]. З'яўляючыся паслядоўнікам ідэй, выказаных яшчэ М. М. Лісоўскім у 1915 г., які вылучыў у кнігазнаўстве вучэнне «о журнализме» (у раздзеле бібліяграфіі), як тэарэтычных ведах пра журналісцкія практыкі, С. М. Срэдзінскі спрабаваў распрацоўваць тэорыю мастацкай будовы кнігі і газеты, што адлюстроўваюць некаторыя яго азербайджанскія[8] і ўкраінскія[9] навуковыя публікацыі, займаўся даследаваннем замежнага паліграфічна-выдавецкага вопыту (амерыканскага[10], чэшскага[11]), гісторыі перыёдыкі і друку[12], зручнасці чытання друкаваных тэкстаў[13], а таксама і перспектыў развіцця матэрыяльнай формы кнігі. «В 1940 году советский книговед С. Н. Срединский, – як адзначае У. Г. Крычэўскі, – довольно убедительно раскрыл в своей курьезной книге-гармошке преимущества "книги-ленты"[14]. Как самый многообещающий рассматривался вариант свитка, помещенного в кассету с механическим приспособлением для перемотки и окном для чтения текста»[15].

Перад тым, як на пачатку 1930-х гг. «ГИЖи» былі пераўтвораны ў «КИЖи» – Камуністычныя інстытуты журналістыкі[16], С. М. Срэдзінскі быў высланы «на перыферыю» – у Азербайджан (магчыма ў 1927 г.) і прадоўжыў працу на створанай у 1928 г.[17] кафедры «Журнализма и Библиологии Азербайджанского Государственного

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[6] Срединский, С. Н. Основы газетного дела : Краткое руководство : Со статьей Н. Ленина «О характере наших газет» : С приложением «Устава Союза Советских Журналистов» / Сергей Н. Срединский. – Петроград : Изд-во Петрогр. Совета раб. и красноарм. Депутатов (Первая гос. типография), 1918. – 75 с.

[7] Срединский, С. Н. Газетно-издательское дело : Основные вопросы газетного хозяйства / С. Срединский. – Москва : ГИЖ, 1924. – 96 с. : табл.

[8] Срединский, С. Н. Значение цвета в печати / С. Н. Срединский ; Азербайджанский гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Баку : [б. и.], 1929. – [19] с. : ил.; Разбор некоторых теорий по оформлению газеты и книги / Сергей Н. Срединский ; Азербайджанский гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Баку : Азерб. гос. ун-т, 1929. – 26 с. – Отд. отт. из т. 16 «Известий педфака Азерб. гос. ун-та»; Художественное оформление газеты и книги / С. Н. Срединский // Известия восточного факультета. – Баку, 1929. – Т. IV. – С. 45-84; Художественное оформление газеты и книги / С. Н. Срединский ; Азербайджанский гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Баку : [б. и.], 1929. – [39] с. : ил. – Отд. отт. из т. 4 «Известий Восточного фак.» С. 45-84.

[9] Срединський, С. Теорія ритму будування книги й газети / С. Срединський // Бібліологічні вісті. – 1930. – № 3. – С. 58-76.

[10] Срединский, С. Газета в Америке / С. Н. Срединский // Журналист. – 1926. – № 11. – С. 27-33; Американская газета. О верстке / комм. С. Срединского // Журналист. – 1927. – №1. – С. 20-26.

[11] «Typografia». Odborny list československých knihtiskařů. 1929. № 1–12 // Бібліологічні вісті. – 1930. – № 4. – С. 128-130. – Підп.: С. Срєдінський [Рецензія].

[12] Срединский, С. Свобода печати и капитализм / С. Срединский // Современник. 1922. – Кн.1. – С. 304-313; Срединский, С. Н. Газетно-издательское дело : [Основные вопросы газетного хозяйства] / С. Н. Срединский. – Москва : ГИЖ, 1924. – 95 с. : табл. ; Срединский, С. Н. О времени основания Академической типографии / Сергей Н. Срединский ; Азербайджанский гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Баку : [б. и.], 1929. – Обл., [4] с.

[13] Срединский, С. Н. Факторы, определяющие легкость чтения вообще, и сравнительную четкость алфавитов в частности / С. Н. Срединский // Культура и письменность Востока. – Баку, 1929. – С. 77-97.

[14] Срединский, С. Н. Книга-лента: Новая форма книги, сокращающая расход бумаги от двух до восьми раз / С. Н. Срединский. – Баку, 1940. – Гл.: С. 377 – URL: https://issuu.com/verapoderskaya-/docs/tipografika_v_terminah_i_obrazah_6e58e37be4b9b7/377

[15] Кричевский, В. Г. Типографика в терминах и образах : в 2 т. / Владимир Кричевский. – Москва : СЛОВО, 2000. – Т. 1: 158 терминов. – С. 119.

[16] У Мінску – у 1932 г.

[17] «В 1928 г. отделение журналистики открыли в Азербайджанском университете» – гл.: http://rulibs.com/ru_zar/nonf_biography/kuznetsov/5/j76.html

Университета»[18], дзе займаў пасаду прафесара[19], з'яўляўся дырэктарам названай кафедры[20], карыстаўся значным аўтарытэтам.

Адной з прычын перамяшчэння С. М. Срэдзінскага маглі быць, як мяркуюць даследчыкі, «чысткі» і рэпрэсіі ў ВНУ СССР. Вясной 1924 г. С. М. Срэдзінскі быў выключаны з камуністычнай партыі, «обвинявшийся в том, что до революции работал в правой черносотенной и октябристской прессе. Это автор широко известного учебника "Основы газетного дела" (Пг., 1918) и один из ведущих штатных преподавателей ГИЖа. Когда в свое время его планировали перебросить из Москвы на редакторскую работу в провинцию, [К. П.] Новицкий [рэктар, звольнены восенню 1924 г. – *Л. Д.*] просил ЦК оставить его в институте»[21]. У Інстытуце журналістыкі ў Маскве разам з С. М. Срэдзінскім працавалі знакамітыя кнігазнаўцы, як Міхаіл Ільіч Шчалкуноў (1884– 1938), чытаў курс гісторыі і тэхнікі кнігадрукавання, быў аўтарам фундаментальных прац па агульным кнігазнаўстве, адлюстроўваючых эвалюцыю развіцця тэхналогіі вырабу рукапіснай і друкаванай кнігі – «Искусство книгопечатания в его историческом развитии» (Масква : ГИЖ, 1923), «История, техника, искусство книгопечатания» (Масква; Ленінград, 1926). У 1931 г. М. І. Шчалкуноў быў звольнены з Інстытута журналістыкі за трацкісцкія погляды, незаконна сасланы ў ГУЛАГ, дзе ў 1938 г. памёр. Падобны лёс напаткаў і некаторых іншых выкладчыкаў маскоўскага «ГИЖа» – Ю. М. Бачарова (1887–1936), І. К. Сіткоўскага (1903–1938), М. Ю. Левідава (1891–1942)[22]. У сярэдзіне 1930-х гг. былі разгромлены кнігазнаўчыя навукова-даследчыя цэнтры, кнігазнаўства як буржуазная навука была забаронена. Перад вайной і ўсе інстытуты журналістыкі былі закрыты, акрамя свярдлоўскага і алма-ацінскага, якія ў ліпені 1941 г. ўвайшлі на правах факультэтаў у склад Уральскага і Казахскага універсітэтаў.

Сляды С. М. Срэдзінскага пасля працы ў Азербайджане, куды з цягам часу даляцелі вятры зменаў у галіне кнігазнаўства (бібліялогіі), а таксама і журналістыкі, выяўляюцца ў пасляваенны час ужо ў Беларусі, якая стала першай у СССР у справе аднаўлення інстытута (аддзялення) журналістыкі (з лістапада 1944 г.). Аднак, з 1 снежня 1947 г. С. М. Срэдзінскі быў прыняты на працу ў МДПІ «дацэнтам кафедры бібліятэказнаўства па сумяшчэнню на ½ штатнай адзінкі» з педнагрузкай у 241 гадзіну [14, арк. 391], а з 1 сакавіка 1948 г. пераведзены на поўную штатную стаўку дацэнта (680 гадзін) [15, арк. 261], праз год, з 1 красавіка 1949 г., «в связи с недостаточностью нагрузки» яго зноў перавялі на палову стаўкі дацэнта [16, арк. 68].

У 1948/1949 н. г. дацэнт С. М. Срэдзінскі, з'яўляючыся штатным выкладчыкам на бібліятэчным факультэце [9, арк. 350 адв.], дзе на чатырох курсах навучалася 87 студэнтаў [9, арк. 381 адв.] (паводле М. Ц. Талкачова – 92 [23, с. 62]), правёў заняткі па «Истории книги» для студэнтаў першага курса (21 студэнт) у аб'ёме 60 гадзін лекцый і 10 практычных, для студэнтаў другога курса – 22 гадзіны лекцый, а таксама і для студэнтаў трэцяга курса – лекцыйны курс [9, арк. 176-177], што можа з'яўляцца

---

[18] Гл.: Культура и письменность Востока. – Баку, 1929. – Кн. 5. – С. 77-97. – URL: https://studylib.ru/doc/2013067/kul._tura-i-pis._mennost._-vostoka

[19] Гл.: Культура и письменность Востока. – Баку, 1930. – Кн. 6. – С. 132. – URL: https://dlib.rsl.ru/viewer/01005509739#?page=134

[20] Срединский, С. Н. Разбор проекта М. И. Идрисова / С. Н. Срединский // Культура и письменность Востока. – Баку, 1930. – Кн. 6. – С. 168. – URL: https://dlib.rsl.ru/viewer/01005509739#?page=170

[21] Фатеева, И. А. «Современник» (1922–1925) – первый журнал по журнализму в России / И. А. Фатеева // Знак: проблемное поле медиаобразования. – 2009. – № 3. – С. 52-57 – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sovremennik-1922-1925-pervyy-zhurnal-po-zhurnalizmu-v-rossii

[22] Фатеева, И. А. Российское газетоведение 1920-х годов: контуры научного направления / И. Фатеева // Коммуникации. Медиа. Дизайн. – Т. 2, № 4. – 2017. – С. 105-122. – URL: https://cmd-journal.hse.ru/article/download/7485/8427/



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сведчаннем таго, што дадзены прадмет для іх раней не чытаўся. Захавалася сціслая інфармацыя пра абмеркаванне праграмы па гісторыі кнігі, якое адбылося, хутчэй за ўсё, у лістападзе 1948 г. [9, арк. 386]. Акрамя «Истории книги» С. М. Срэдзінскі вёў і іншыя дысцыпліны: на трэцім курсе – «Библиографию сельскохозяйственной литературы», «Библиографию естественно-научной литературы», «Библиографию общественно-политической литературы», на чацвёртым курсе – «Историю искусства» [9, арк. 178-179].

На працягу двух навучальных гадоў С. М. Срэдзінскі прымаў актыўны ўдзел у жыцці інстытута: уваходзіў у склад Бібліятэчнага савета, выступаў на пашыраных пасяджэннях Вучонага савета (членамі Савета з’яўляліся дэкан бібліятэчнага факультэта Людміла Мікалаеўна Прэабражэнская і загадчык кафедры бібліятэказнаўства Іосіф Бенцыянавіч Сіманоўскі), на якіх, напрыклад, закраналіся ідэалагічныя пытанні барацьбы «с проникновением в советскую науку реакционных идеалистических творений», падтрымкі і папулярызацыі вучэння І. У. Мічурына [8, арк. 10], абмяркоўваліся вынікі і планы працы інстытута [8, арк. 33-34]. Менавіта з выступлення С. М. Срэдзінскага на адным з пасяджэнняў Вучонага савета (25.02.1949) пачынаецца абмеркаванне праблем бібліятэчнага факультэта, звязаных з забеспячэннем вучэбнай дзейнасці спецыяльнай літаратурай. С. М. Срэдзінскі выказвае прапановы, што неабходна «просить Министерство о пополнении институтской библиотеки книгами из Государственного литературного фонда, который отпустил книги университету, политехническому институту и другим вузам Белоруссии; необходимо выработать особую инструкцию по проведению производственной практики на библиотечном факультете, так как эта практика проводится неудовлетворительно; надо пополнить библиотечный факультет литературой по библиотечному делу, которой в институтской библиотеке нет» [8, арк. 33]. Яго падтрымліваюць І. Б. Сіманоўскі, які адзначае, што «Библиотечному факультету недостает многих преподавателей по ряду предметов, что вызывает некоторые недочеты в работе факультета. <…> кабинета по библиотечному делу, в сущности, нет, так как нет соответствующих книг и пособий»; Л. М. Прэабражэнская яшчэ больш акцэнтуе ўвагу на тым, што «библиотечный факультет работает в тяжелейших условиях; из-за отсутствия преподавателей некоторые курсы не читаются» [8, арк. 34].

Аднак галоўную адказнасць кіраўніцтва МДПІ ўскладвала на кафедру і дэканат бібліятэчнага факультэта, якія, па словах дырэктара інстытута М. В. Макарэвіча, «еще работы по-настоящему не развернули» [10, арк. 24]. І сапраўды, хоць і прыцягваліся да выкладання вопытныя бібліёграфы і бібліятэкары-практыкі з Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (Ніна Барысаўна Ватацы, Разалія Герасімаўна Любіна, Марыя Ільінічна Масенжнік, Ніна Варфаламееўна Каляда) і іншых бібліятэк, дзякуючы якім адбывалася пераемнасць і дасканаленне прафесійных ведаў, аднак сумяшчальніцтва мела і другі бок: тармазіла фарміраванне ўласнай навукова-педагагічнай школы.

29 студзеня 1949 г. дэкан факультэта, гісторык Л. М. Прэабражэнская адзначала: «Обилие совместителей и приезжих преподавателей усложняет работу на библиотечном факультете и затрудняет подготовку квалифицированных кадров библиотечных работников для БССР. Необходимо подготовить местные кадры научных работников библиотечных дисциплин» [9, арк. 350 адв.]. Яна таксама звярнула ўвагу на адсутнасць сістэмнасці і лагічнай паслядоўнасці ў выкладанні спецыяльных дысцыплін, якія «проходились залпом, сгущенно по 2 и даже 4 часа ежедневно. <…> Вызывалось это с одной стороны тем, что ту или иную дисциплину вел приезжий преподаватель (например, Толкачев), который в короткий срок приезда должен был выполнить программу, прочитать курсы и принять экзамен или зачет. С другой стороны, сгущенность прохождения библиотечных дисциплин вызывалась тем, что в виду отсутствия преподавателей-специалистов по библиотечным дисциплинам, приходилось



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ставить в расписание те дисциплины и тех преподавателей, которые имелись в данный момент в институте» [9, арк. 383 адв.].

Праўда, на пачатку другага семестра 1948/1949 н. г. «приезжий преподаватель Толкачев» – Мікалай Цімафеевіч Талкачоў, замацоўваецца на стала ў Мінску як дацэнт кафедры бібліятэказнаўства (працаваў у МДПІ з верасня 1946 г. [23, с. 63]). На пачатаку 1949/1950 навуч. года была залічана на пастаянную працу і старшы выкладчык Капіталіна Гардзееўна Маўрычава (з 1.10.1949 г. [16, арк. 287]), з якой звязана развіццё ў ВНУ асноў курса «Работа з читателями» [22, арк. 4] і навуковых даследаванняў у гэтым кірунку. Пачынаючы з 1946 навуч. года кафедра бібліятэказнаўства налічвае толькі то аднага, то двух, то трох штатных выкладчыкаў [23, с. 61, 64], астатнія, у іх ліку загадчык кафедры, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР І. Б. Сіманоўскі, былі сумяшчальнікамі ці пагадзіннікамі [10, арк. 23].

«Вместо выбывшего» штатнага выкладчыка С. М. Срэдзінскага з 1949/1950 па 1953/1954 навуч. год уключна курс «История книги», прадоўжыў і чытаў старшы выкладчык-пагадзіннік [13, арк. 37] *Гаўрыіл Сяргеевіч Акулаў* [17, арк. 4] *(Гавриил Сергеевич Окулов/Акулов)* – штатны выкладчык кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку аддзялення журналістыкі БДУ [12, арк. 54], дзе таксама былі падобныя кадравыя праблемы. Толькі ў 1948/1949 навуч. годзе, як сведчыць справаздача кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку БДУ, зафіксаваны «факт выполнения (впервые за послевоенные годы) программы по всем трем профилирующим дисциплинам: истории русской журналистики, истории большевистской печати и теории и практике советской печати» [1, арк. 81]. Гістарычныя курсы да гэтага не былі забяспечаны выкладчыцкімі кадрамі, таму і не чыталіся, а ўдалося гэта ажыццявіць дзякуючы папаўненню кафедры трэцім штатным выкладчыкам, якім і стаў Г. С. Акулаў (1888 г. нараджэння; на журналісцкім адзяленні БДУ з 1948 да 1958 г.). Ён з’яўляўся выпускніком Пецярбургскага псіханеўралагічнага інстытута (1914), быў членам КПСС, не меў навуковай ступені ці вучонага звання [4, арк. 18], аднак валодаў стажам практычнай журналісцкай дзейнасці ў газеце «Правда» (Масква), і атрымаў у БДУ спачатку пасаду старшага выкладчыка, а ў хуткім часе і дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку, у 1950 г. займаў пасаду загадчыка аддзялення журналістыкі на Філалагічным факультэце БДУ [3, арк. 35, 43]. Чытаў курсы «История журналистики», «Истории большевистской печати», «Техника газеты» [2, арк. 17-23], у 1952/1953 навуч. годзе склаў вучэбную праграму па гісторыі рускай журналістыкі (XVIII–XIX стст.) [6, арк. 130], у 1953/1954 н. г. – па гісторыі партыйна-савецкага друку [7, арк. 84]. Асноўныя навуковыя тэмы, якія вёў у БДУ Г. С. Акулаў – «Белорусская советская печать в период воссоединения белорусского народа в едином советском государстве», «“Правда” о воссоединении белорусского народа в едином государстве» [5, арк. 30]. Упершыню ў 1950/1951 навуч. годзе ў БДУ былі праведзены два спецкурсы па гісторыі беларускага савецкага друку (1917–1925 гг.) і гісторыі замежнай літаратуры і друку [5, арк. 28].

У першы год сваёй працы на бібліятэчным факультэце МДПІ ў 1949/1950 н. г. Г. С. Акулаў вычытаў па дысцыпліне «История книги» 70 гадзін лекцый на першым курсе [11, арк. 341], у наступным навучальным годзе праводзіў таксама і практычныя заняткі [18, арк. 173]. У загадах МДПІ яго пасада, як і прозвішча – «Окулов», «Акулов», указваюцца па-рознаму: выкладчык (студзень 1950 г.) [17, арк. 4], дацэнт (снежань 1950 г.) [18, арк. 173], старшы выкладчык (студзень 1952 г. [19, арк. 17], студзень, жнівень 1953 г. [20, арк. 20, 184]), выкладчык (чэрвень 1954 г.) [21, арк. 20]. Удзел Г. С. Акулава ў жыцці МДПІ і бібліятэчнага факультэта абмяжоўваўся толькі правядзеннем вучэбных заняткаў па «Истории книги» – лекцыйнах і практычных на стацыянары, вячэрнім і завочным аддзяленнях, экстэрнатуры. Дакладна не вядома ці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распрацоўвалася ім праграма курса. У цэлым, неабходна заўважыць, што і загадчык кафедры бібліятэказнаўства прызнаваў, што асноўным недахопам у працы кафедры з'яўляецца адсутнасць сістэматычна распрацаваных вучэбных матэрыялаў [13, арк. 44].

Пэўнымі крыніцамі, якія маглі выкарыстоўвацца па курсу «История книги», служылі вынікі працы выкладчыкаў іншых кафедр МДПІ, як даследаванне па гісторыі друку загадчыка кафедры гісторыі СССР і БССР Івана Сяргеевіча Краўчанкі [10, арк. 16], які падрыхтаваў і выпусціў навуковае выданне па тэме «Падпольны бальшавіцкі друк у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (Мінск, 1950). З кнігазнаўчай тэматыкай былі звязаны навуковыя і вучэбныя распрацоўкі старшага выкладчыка кафедры бібліятэказнаўства К. Г. Маўрычавай, якая з 1947 г. займалася даследаваннем жыцця і дзейнасці М. А. Рубакіна[23], спрабавала вывучаць гісторыю бібліятэк Беларусі[24], чытацкія інтарэсы[25]. Метадам самастойнай работы з кнігай прысвячаліся работы М. Ц. Талкачова[26], які вялікую ўвагу надаваў гістарычным і метадалагічным пытанням бібліяграфічнай дзейнасці, рыхтаваў першыя ў Беларусі праграмы і вучэбныя дапаможнікі па бібліяграфіі. У 1950-я гг. актуальнай навуковай тэмай заставалася прапаганда чытання, а таксама і беларускай літаратуры (В. П. Іванова, Н. Б. Ватацы).

У першае дзесяцігоддзе існавання бібліятэчнага факультэта выкладанне гісторыі кнігі – «Истории книги» – было звязана не толькі са значнымі праблемамі пасляваеннага ўзнаўлення навукова-педагагічнага патэнцыялу (кадравага, матэрыяльна-рэсурснага), але і з метадалагічнымі супярэчнасцямі паміж назапашаным даваенным навуковым вопытам у галіне кнігазнаўства і журналізма – з аднаго боку, а з іншага – з далейшым развіццём узаемадзеяння гісторыі кнігі з гісторыяй савецкага друку, што не магло не паўплываць на развіццё гісторыі кнігі як прадмета, што адлюстроўваў найбольш гісторыю выдавецкай дзейнасці. Адсутнасць стабільнасці ў метадычным і тэарэтычным забеспячэнні курса, адцягвала ў тым ліку і падрыхтоўку ўласных навуковых і выкладчыцкіх кадраў для гісторыка-кнігазнаўчай галіны ў МДПІ да сярэдзіны 1950-х гг. Ты не менш, дзякуючы першым выкладчыкам «Истории книги» С. М. Срэдзінскаму і Г. С. Акулаву гэты прадмет атрымаў далейшае развіццё, а ў наступныя 1960-я – 1970-я гады пачаў дапаўняцца беларускай тэматыкай.


1. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 165.
2. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 166.
3. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 202.
4. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 231.
5. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 262.
6. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 355.
7. *НА* РБ. – Ф. 205, воп. 5, спр. 380.
8. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 22.
9. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 25.
10. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 33.
11. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 35.
12. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 40.
13. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 69а.


[23] Мавричева, К. Г. Н. А. Рубакин (1862–1946) / К. Г. Мавричева. – Москва : Книга, 1972. – 176 с. : ил. – (Деятели книги).

[24] Мавричева, К. Г. Первая народная библиотека на селе в Белоруссии / К. Г. Мавричева // Библиотекарь. – 1956. – № 11. – С. 37-40.

[25] Мавричева, К. Г. Об изучении читательских интересов / К. Г. Мавричева // Библиотекарь. – 1957. – № 5. – С. 22-27.

[26] Толкачев, Н. Т. Самообразование и методы работы с книгой / Н. Т. Толкачев. – Минск : АН БССР, 1951. – 37 с. – (О-во распространения политических и научных знаний БССР).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 9.
15. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 20.
16. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 25.
17. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 28.
18. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 29.
19. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 43.
20. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 47.
21. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 51.
22. *НА* РБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 254.
23. *Толкачев, Н. Т.* Из истории высшего библиотечного образования в БССР / Н. Т. Толкачев // Ученые записки / Мин. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1956. – Вып. 6. – С. 55-71.

***Друк Галіна Мацвееўна***

## *«Час – гэта мы»*: да юбілею факультэта

У артыкуле коратка пададзена гісторыя ўтварэння кафедры беларускай і замежнай філалогіі ў складзе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, зроблены агляд асноўных кірункаў яе дзейнасці.

*Ключавыя словы:* кафедра; адукацыя і выхаванне; навуковая дзейнасць; традыцыі; творчасць.

***Halina M. Druk***

## «Time is Us»: the Faculty Anniversary

The article provides a brief history of the creation of the Department of Belarusian and Foreign Philology as a part of the Faculty of Information and Document Communications, and gives a review of the main activities of the Department.

*Keywords:* Department; education and training; scientific activity; traditions; creativity.

*Пакліч – былое адгукнецца*
*Жалейкаю за хваіной;*
*Скраніся – і важкой хадой*
*Наступнае ў паход кранецца.*
*А. Куляшоў*

Кафедра беларускай і замежнай філалогіі – адно з гістарычна важных падраздзяленняў у структуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, лёс якога ў пэўнай ступені нагадвае чалавечы ці нават самой Беларусі. Свой шлях кафедра пачынала ў 1975 годзе як літаратурная і ідзе гэтым шляхам больш за 40 гадоў, атрымліваючы ў розныя перыяды новыя «імёны». Апошнімі істотнымі вехамі ў гісторыі кафедры былі 2006-ы і 2018-ы гады, калі яна перажывала аб'яднанне з іншымі структурнымі падраздзяленнямі, што былі самастойнымі таксама з 1975 года. Напрыклад, з кафедрай сусветнай літаратуры (якую ўзначальвала з 1993 па 2006 гады прафесар, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Н. А. Булацкая[27]) – тады атрымала назву

[27] Як загадчык кафедры Н. А. Булацкая ініцыявала перамены і садзейнічала новаму выкладанню літаратуры ў сувязі з пераходам на шматузроўневую ўніверсітэцкую сістэму навучання: у вучэбны працэс былі ўведзены спецкурсы і курсы па выбары (да прыкладу, у 1993г. іх было 5, а ў 1994г. – 10), дзяржаўны экзамен па сусветнай літаратуры на факультэце завочнага навучання, курс сусветнай літаратуры стаў выкладацца асобнымі часткамі як «Літаратура краін Заходняй Еўропы і Амерыкі (ад антычнасці па сучаснасць)» і «Славянскія літаратуры». Кафедра мела кантакты з амбасадамі Расіі, Японіі, запрашала выкладаць літаратуру знакамітых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ